**Пытальнік**

## Чалавек можа мець некалькі льгот адначасова

**У апошні час «Звязда» змясціла шэраг матэрыялаў, звязаных з абмеркаваннем і прыняццем Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь законапраекта аб льготах. Сцвярджаецца, што ў краіне дзве трэці насельніцтва з'яўляюцца льготнікамі — 6,5 млн чалавек. З чаго складаецца гэта лічба? Эканамічна актыўнае насельніцтва ў Беларусі складае прыкладна 4,4 млн чалавек, а калі адкінуць працуючых пенсіянераў, дык атрымліваецца 4 млн. Дык што, выходзіць, што ў нас кожны жыхар (нават эканамічна актыўны) мае льготы? Ці маецца на ўвазе, што чалавек можа карыстацца некалькімі льготамі (як ліквідатар, як пенсіянер, як ветэран працы)?**

П.У. Рогач, *г. Мінск.*

Па-першае, як патлумачылі нам у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, ніхто працуючых пенсіянераў ільгот не пазбаўляў (гэта наконт заўвагі чытача — «адкінуць» працуючых пенсіянераў з агульнай лічбы льготнікаў). Па-другое, заяўнік сапраўды мае рацыю: адзін чалавек можа мець і дзве, і тры, і нават чатыры льготы. Напрыклад, пенсіянер, інвалід II групы па агульнаму захворванню, які пражывае ў сельскай мясцовасці, плаціць за лекі толькі 10 працэнтаў ад іх кошту, мае бясплатны праезд (у межах краіны) на транспарце, і плаціць 50 працэнтаў ад кошту за тэлефон і электраэнергію. Такім чынам, адзін чалавек мае тры льготы.

**Звязда-90: адваротны адлік**

Да юбілею «Звязды» засталося **65 дзён**

## Ігар БЫШНЁЎ: ПРЫЕМНА, ШТО «ЗВЯЗДА» ШМАТ ПІША ПРА ПРЫРОДУ!



Добры сябра нашай газеты — вядомы далёка за межамі Беларусі біёлаг, эколаг, аўтар і сааўтар пяці кніг, фотаальбомаў «Спеў глушца», «Скарбы прыроды Беларусі», «Прыпяць — жывая вада Палесся», рэжысёр, сцэнарыст, аператар, аўтар фільмаў і сацыяльных відэаролікаў аб прыродзе, кіраўнік праграмы стварэння відэафільмаў аб некранутай прыродзе Беларусі на РУП «Беларускі відэацэнтр», двойчы лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта ў галіне культуры і мастацтва (у 2003 і 2006 гадах) Ігар Бышнёў павіншаваў «Звязду» з юбілеем, калі знаходзіўся на тэрыторыі Бярэзінскага дзяржаўнага запаведніка, у Лепельскім раёне. Тут грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны», у якой ён з'яўляецца дырэктарам па развіцці і сувязях з грамадскасцю, праводзіла прэс-тур для журналістаў Віцебшчыны. Дарэчы, дзякуючы «АПБ» у «Звяздзе» было надрукавана шмат цікавых артыкулаў, прысвечаных роднай прыродзе.

— Шчыра віншую чытачоў «Звязды» і супрацоўнікаў рэдакцыі з юбілеем! Жадаю «Звяздзе» поспехаў! Прыемна, што газета часта звяртаецца да тэмы прыроды Беларусі: расказвае аб заказніках, запаведніках, унікальных відах раслін, птушках і жывёлах і такім чынам займаецца экалагічным выхаваннем сваіх чытачоў. Жадаю, каб і далей «Звязда» займалася гэтай добрай справай. З надзеяй на далейшае такое плённае супрацоўніцтва!

## У Гомелі пасяліўся Гулівер



Фота Мікалая БЯЛЬКОВІЧА.

**З'явіўся ён на скрыжаванні вуліц Сасновай і Рэчыцкай шашы ў Савецкім раёне горада — славуты казачны велікан, выраблены са сталі. З вышыні сямі з паловай метраў ён як бы аглядае наваколле сквера, у якім застыла яго постаць, і ўсім сваім выглядам паказвае, што аберагае спакой гамяльчан. Асабліва дзяцей, якія палюбілі Гулівера яшчэ з кніжак і для якіх яго з'яўленне ў горадзе стала прыемным сюрпрызам.**

Работы над стварэннем скульптурнай кампазіцыі «Гулівер» вяліся некалькі месяцаў. А задумала яе вядомая ў горадзе скульптар Тамара Дзмітрыева пры падтрымцы кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна Таццяны Філімончык. Так і ўзніклі эскізы і паменшаная мадэль скульптуры. Як кажуць, рукі да кампазіцыі прыклалі калектывы інстытута «Гомельбудпраект» і камунальнага прадпрыемства «Аўторыя», а днём нараджэння яе стаў першы дзень лета — Міжнародны дзень абароны дзяцей. На свята прыйшлі старшыня Гомельскага гарвыканкама Аляксандр Бяляеў і памянёная вышэй Таццяна Філімончык.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### МІНФІН НЕ СУПРАЦЬ

Міністэрства фінансаў Беларусі не супраць адмены абаротных падаткаў у 2008 годзе. Аднак пры гэтым узнікае пытанне аб падвышэнні ставак ПДВ. Аб гэтым паведаміў журналістам міністр фінансаў Мікалай Корбут.

**БЕЛТА.**

## Брэстчына — «За незалежную Беларусь»

**У мінулую пятніцу больш за чатыры тысячы гледачоў сабраў у Брэсце спарткомплекс «Вікторыя». Усе білеты былі прададзеныя яшчэ напярэдадні. Абласная філармонія — адзін з арганізатараў акцыі спачатку мела намер праводзіць канцэрт на стадыёне «Дынама», каб размясціліся ўсе жадаючыя. Але сіноптыкі не далі ніякіх гарантый, таму мерапрыемства вырашана было перанесці пад дах спартыўнага комплексу.**

Перад пачаткам праграмы слова ўзяў кіраўнік вобласці Канстанцін Сумар. Ён прывітаў удзельнікаў гэтай патрыятычнай акцыі, сказаў, што нам пад сілу любыя праекты, бо мы абапіраемся на вопыт ветэранаў і энергію моладзі. «Брэстчына з упэўненасцю глядзіць у заўтрашні дзень, і залог такой упэўненасці — жаданне ўсіх працаваць у імя далейшага росквіту нашай роднай зямлі», — сказаў губернатар і перадаў эстафету артыстам.

Як самых лепшых сяброў прымалі гледачы Ірыну Дарафееву, Іскуі Абалян, Вікторыю Алешка і іншых беларускіх знакамітых спевакоў. А з'яўленне на сцэне Віктара Паплаўскага і Аляксандра Ціхановіча зала сустрэла літаральна авацыяй. Іх старая добрая «Малінаўка» навеяла ўспаміны маладосці для адных і падарыла зарад бадзёрасці іншым. «Брэст, мы любім цябе!» — раздавалася раз-пораз са сцэны, і скрозь апладысменты ўгадваўся адказ «Мы таксама любім вас!».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Па просьбе чытачоў**

# «КЛУБНІЧНЫЯ» АБЯЦАНКІ

### Каб не застацца ў дурнях пры працаўладкаванні за мяжой, трэба ведаць свае правы і абавязкі

**Жыхарку абласнога цэнтра Вераніку С., якая патэлефанавала ў гродзенскі карпункт нашай газеты, зацікавіла аб'ява на прыпынку грамадскага транспарту. Паведамлялася, што замежная кампанія шукае людзей для збору клубніц у чэрвені—ліпені на тэрыторыі Польшчы. Патрабуюцца працавітыя і добрасумленныя жанчыны ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў. Работа — легальная, згодна з патрабаваннямі заканадаўства. Зарплата — ад 450 у.а. і больш. Пражыванне і харчаванне (чатыры разы на дзень) — бясплатныя.**

**Але вось што насцярожыла нашу чытачку. Па-першае, калі работа сапраўды легальная, то чаму гэта аб'ява змешчана не ў газеце, а на слупе? А па-другое, побач з сумай абяцанага заробку нехта напісаў: «Няпраўда, $80». Мо, гэты чалавек ужо мае вопыт працы на клубнічных плантацыях і рэаліі зусім не адпавядаюць абяцанкам?**

**Па тлумачэнні наконт гэтага і іншых пытанняў, якія звязаны з працаўладкаваннем беларускіх грамадзян за мяжой, карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да галоўнага спецыяліста ўпраўлення па грамадзянству і міграцыі УУС Гродзенскага аблвыканкама Валянціны Шуляк.**

**— Валянціна Іванаўна, каму на тэрыторыі Гродзеншчыны дазволена займацца дзейнасцю па працаўладкаванню нашых грамадзян за мяжой?**

— Адпаведную ліцэнзію Міністэрства ўнутраных спраў на права ажыццяўлення дзейнасці, звязанай з прыцягненнем у Рэспубліку Беларусь замежнай рабочай сілы і працаўладкавання нашых грамадзян за мяжой, атрымалі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (адрас абласной арганізацыі: г. Гродна, вул. Савецкая, 31), прыватнае сэрвіснае ўнітарнае прадпрыемства «Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва занятасці моладзі і студэнтаў» (г. Гродна, вул. Сакалоўскага, 20) і індывідуальны прадпрымальнік Нікалаевіч (г. Гродна, вул. Паповіча, 5).

**— Як бачым, замежных кампаній сярод ліцэнзіятаў няма...**

— Замежная фірма не можа займацца на нашай тэрыторыі дзейнасцю па працаўладкаванню грамадзян Беларусі за мяжой. Але яна мае права заключыць працоўнае пагадненне з беларускай юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам, у якіх ёсць такая ліцэнзія.

Хачу падкрэсліць, што ліцэнзія выдаецца не ўвогуле на працаўладкаванне за мяжой, а на канкрэтны від дзейнасці. Скажам, агенцтва, якое заключыла дагавор на стажыроўку студэнтаў аграрных ВНУ у Вялікабрытаніі, не можа накіроўваць рабочых будаўнічых спецыяльнасцяў у Расію, Польшчу або Чэхію. А індывідуальны прадпрымальнік, які аказвае пасрэдніцкія паслугі па працаўладкаванню будаўнікам, не мае права заключаць нейкія пагадненні са студэнтамі, паколькі для гэтага патрабуецца адпаведны дазвол Міністэрства адукацыі. Пры гэтым юрыдычная асоба або індывідуальны прадпрымальнік павінны праводзіць прыём патэнцыяльных кліентаў толькі па месцы сваёй рэгістрацыі.





Фота Пятра ФАМІНА.

**— На што трэба перш за ўсё звяртаць увагу, калі чалавеку прапануюць работу за мяжой?**

— Найперш — уважліва азнаёміцца з ліцэнзіяй. На першай старонцы ўказана, каму і якім рашэннем яна ўручана, ёсць нумар, дата выдачы і тэрмін дзеяння. На другой старонцы пазначана, чым мае права займацца гэты пасрэднік пры працаўладкаванні за мяжой, якія дагаворы ён абавязаны мець і як гэтыя дакументы павінны быць афармлены. Выехаць на законных падставах працаваць за мяжу нельга, калі ў вас не будзе заключаны дагавор з замежным наймальнікам (праз пасрэдніка), які павінен быць зарэгістраваны ва ўпраўленні па грамадзянству і міграцыі УУС. Для гэтага патрэбны дакументы, якія пацвярджаюць юрыдычны статус замежнага наймальніка, наяўнасць у яго дазволу на ажыццяўленне дзейнасці па працаўладкаванню іншаземцаў на сваёй тэрыторыі. Усю дакументацыю неабходна прадаставіць чалавеку на беларускай ці рускай мове і ён павінен з ёй азнаёміцца. Каб не проста ехаць у нікуды, а валодаць усімі неабходнымі звесткамі аб тых, хто яго запрашае на работу.

**— А як рэагаваць на вышэйпамянёныя аб'явы?**

— Той, хто ва ўстаноўленым законам парадку займаецца працаўладкаваннем нашых грамадзян за мяжой, мае права даваць рэкламу ў СМІ, але яна праз кожныя тры месяцы павінна пераўзгадняцца ў Дэпартаменце па грамадзянству і міграцыі МУС. А што датычыцца аб'яў на слупах, то гэта наогул незаконна. І калі нам хочацца жыць у прававой дзяржаве, то найперш мы, грамадзяне Беларусі, абавязаны гэту законнасць ахоўваць. Гэта значыць, трэба прад'явіць рэквізіты пасрэдніка ва ўпраўленне па грамадзянству і міграцыі або ў іншыя органы ўнутраных спраў, каб былі прыняты адпаведныя меры.

І галоўнае: пры працаўладкаванні за мяжой, каб не застацца ў дурнях, «эканамічным рабом», трэба дакладна ведаць свае правы і абавязкі. Адпаведная заканадаўчая база ў нашай краіне ёсць — гэта Дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 3 і № 17, закон аб знешняй працоўнай міграцыі. Гэтымі дакументамі вызначаны ўсе неабходныя ўмовы пры заключэнні працоўных дагавораў. Гэта датычыцца і праезду, і пражывання, і харчавання, і тэрміну работы, і аплаты звышурочнай, у выхадныя дні, і медыцынскага абслугоўвання... І калі па віне працадаўцы ўмовы кантракта парушаюцца, то ў работніка ёсць магчымасць яго перапыніць і спагнаць кампенсацыю. Але толькі тады, калі чалавек працуе легальна. Калі ж ён, выязджаючы за мяжу, праігнараваў усе вышэйпамянёныя «правілы гульні», то дапамагчы яму практычна немагчыма..

Таму перш чым прыняць рашэнне аб працаўладкаванні за мяжой, рэкамендую звярнуцца па кансультацыю ва ўпраўленне грамадзянства і міграцыі УУС. Наконт пытанняў па бяспечнай міграцыі можна таксама патэлефанаваць на гарачую лінію «Ла Страда» ( тэл. 8-801 100 8 801, званок бясплатны па ўсёй тэрыторыі Беларусі). Вас азнаёмяць з агульнымі правіламі бяспечнага выезду, з правамі мігрантаў, тэлефонамі і адрасамі арганізацый за мяжой, куды можна звярнуцца ў складанай сітуацыі, дапамогуць разабрацца ў схеме працаўладкавання за мяжу і дакументах для афармлення кантракта і візы, пасадзейнічаюць у праверцы легальнасці работы беларускага пасрэдніка.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

ОАО «УНИВЕРСАМ ЗАСЛАВЛЬ»
**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,**
**которое состоится 8 июня 2007 года в 15 часов по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 49.**
*Повестка дня:*
1. О внесении изменений в кредитный договор и договор залога.
***Начало регистрации в 14 часов 30 минут.***
***При себе иметь паспорт.***
**Телефон для справок: (017) 203-89-17.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА НА АУКЦИОНЕ**
**ЗАО «ВЦ «АКВАБЕЛ» Минский район проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества:**

| № лота | Наименование объекта недвижимости | Общая площадь, кв.м | Жилая площадь, кв.м | Начальная цена за 1 кв.м, у.е. | Адрес объекта |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Квартира № 55 | 141,6 | 79 | 1 800 | г. Минск, ул. Беломорская, 4а |
| 2 | Квартира № 61 | 142,3 | 78,4 | 1 800 | г. Минск, ул. Беломорская, 4а |

1 у.е. равен 1 доллару США по курсу НБ РБ на день произведения оплаты.
Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на р/с № 3012204960010 в филиале ОАО «Белагропромбанк» МГД г. Минск, ул. Ольшевского, 24, код 963, УНН 600438617, ОКПО 28976346, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 9 июля 2007 г. в 11.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 8.07.2007 г. до 17.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. **Контактный телефон: (8-017) 237-93-93.**

# ПРЫГОЖА, СТЫЛЬНА, ХУТКА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Майстра, паводле яго прызнання, стрыгуць сябры. Вучыцца Іван у Гродзенскім прафесійна-тэхнічным каледжы бытавога абслугоўвання насельніцтва, ён ужо атрымаў спецыяльнасць «цырульнік» і працягвае вучобу на другім узроўні — «мастак-мадэльер».

У паўсядзённым жыцці Ваня выконвае і жаночыя прычоскі, аднак на спаборніцтвах, кажа, больш упэўнена сябе адчувае з мужчынскімі работамі.

— Відаць, таму, што практыкавацца пачаў на хлопцах, — зазначае цырульнік.

Гэта першы вопыт майстра на чэмпіянаце «Стыль і прыгажосць», аднак далёка не першы конкурс у яго жыцці. У прыватнасці, зусім нядаўна Іван удзельнічаў у міжнародных спаборніцтвах у рамках фестывалю прыгажосці «Неўскія берагі». Днямі яму прадаставілася магчымасць паўдзельнічаць у спаборніцтвах на радзіме:

— Зроблена шмат папярэдняй працы — усе накірункі задаюцца загадзя, удзельнікі павінны збіраць інфармацыю, удзельнічаць у падрыхтоўчых семінарах.

Каляровую гаму сваёй працы Іван афарміў так — чорны корань, а на астатніх валасах — адценні сіняга, зялёнага, чырвонага. З намі малады цырульнік падзяліўся і некаторымі адметнасцямі моднай мужчынскай стрыжкі:

— Раней здымалі больш валос на грыўцы, а зараз усе гэтыя чубкі-іракезы перамясціліся на макушку. Такая вось яшчэ тэндэнцыя, што чым даўжэйшыя валасы на скронях, тым лепш. Прычоскі хлопцаў наогул зараз выглядаюць дастаткова жаноцкімі — такая мода. Чым больш салодкі вобраз у юнака-мадэлі, тым выдатней.

З тым, што цырульнік — прафесія жаночая, Іван, зразумела, нязгодны:

— Адкрыйце любы часопіс і ўбачыце: самыя масцітыя майстры — мужчыны.

Аднак большасць сапернікаў Івана на сёлетніх спаборніцтвах — усё ж такі жанчыны...

На чэмпіянаце майстры абмежаваны часовымі рамкамі (жаночую крэатыўную прычоску, напрыклад, трэба было выканаць усяго за 18 хвілін, а аналагічную мужчынскую — за 20), патрабаваннямі да каляровай гамы (фарбуюць мадэляў, зразумела ж, загадзя) і выкананню абавязковых элементаў. За парушэнні налічваюцца штрафныя — спаборніцтва ёсць спаборніцтва, нават калі справа датычыцца прыгажосці.

Цікава было даведацца пра ўражанні саміх мадэляў, якіх на чэмпіянаце было звыш 700, мы пагутарылі з яшчэ адным гродзенцам — **Данілам Куклевым.** У такой якасці хлопец, які літаральна праз месяц з невялічкім стане паўналетнім, выступаў упершыню:

— Мадэллю я стаў амаль выпадкова: мама падчас стрыжкі даведалася, што яе цырульнік шукае для конкурсу хлопца з доўгімі валасамі (перад чэмпіянатам даўжыня валасоў Даніла дасягала 20 сантыметраў).

Даніл ні аб чым не шкадуе — ні аб страчаных валасах, ні аб рызыцы і экстрэмальнасці мерапрыемства (на галаве ў яго цяпер ледзь не ўсе колеры вясёлкі — фіялетавы, вогненна-рыжы, папялісты, бірузовы, сіні, чорны):

— У мяне з'явілася шмат новых знаёмых, я выдатна правёў час, мне даспадобы сама тутэйшая атмасфера — з табою ўсе хочуць сфатаграфавацца, а некалькі дзяўчат і нумар тэлефона папрасілі! (Задаволена ўсміхаецца.)

Журы працуе доўга — хвілін 40 — увесь гэты час мадэлі трэба сядзець нерухома і трымаць задуманы майстрам вобраз. Што адчуваюць гэтыя бедалагі, аб чым думаюць, углядаючыся ў люстэрка?

— Адчуваеш толькі боль у спіне і думаеш: «Хутчэй бы гэта скончылася», — шчыра дзеліцца ўражаннямі юнак, якому стварылі вобраз экстрэмальнага, энергічнага хлопца, упэўненага і самастойнага — нядзіўна, з такой расфарбоўкай.

Пакуль журы рабіла канчатковыя падлікі, на подыуме ладзілася феерычнае шоў — госці любаваліся працай мастакоў-мадэльераў і карыфеяў ад цырульніцкага мастацтва, а таксама прыгажосцю ў стылі «ню» — прыроднае харáство жаночага цела было ўтоена (або наадварот падкрэслена?!) бодзі-артам. Вядучая Анастасія Ціхановіч у фінале падарыла гасцям некалькі сваіх песень, вакальныя падарункі ўсім стыльным і прыгожым падрыхтавалі таксама Дзмітрый Карпінчык, старэйшы з братоў Калдуноў (між іншым, «Суперфотамадэль Беларусі-1999») і іншыя выканаўцы.

Выдатную праграму падрыхтавалі навучальныя цэнтры — Мінскі тэхналагічны каледж, Прыватны навучальны цэнтр Сяргея Вайцяхоўскага, навучальны цэнтр ААТ «Усход».

Тыя, каму пашчасціла заняць прызавыя месцы, атрымалі дыпломы, медалі, кубкі і бардовыя ружы. Дыплом прызёра абяцае цырульніку павышэнне кваліфікацыі. Пераможцы былі названы ў 14 намінацыях (ацэньваліся стрыжкі, укладкі, прычоскі, макіяж, модны вобраз — Fool fashion look), асноўнымі тут былі, вядома ж, тэхнічныя катэгорыі. Акрамя таго, назвалі лепшых спецыялістаў пазногцевага сэрвісу. Гран-пры атрымала мінчанка Вераніка Квяткоўская, якая выканала працу па арт-дызайну пазногцяў на сусветным узроўні. Сталічныя цырульнікі лідзіравалі ў камандным заліку і па жаночых, і па мужчынскіх відах прац і ўзялі камандны кубак.

Спадзяёмся, з кожным такім чэмпіянатам беларусы будуць станавіцца ўсё больш стыльнымі і прыгожымі, а нашы майстры — паказваць усё лепшыя вынікі на міжнародных спаборніцтвах.

**Ала МАЧАЛАВА.**

**Еўра-2008**

# КРАХ НАДЗЕЙ

### Балельшчыкі верылі ў каманду. А каманда ў сябе?

**Падначаленыя Юрыя Пунтуса, на жаль, не змаглі наблізіцца да лідараў у сваёй сямёрцы: беларусы засталіся на чацвёртым радку з тымі ж 7 ачкамі, бо ў мінулую суботу ўступілі ў адборачным матчы балгарам (0:2), якія ператвараюцца ў аднаго з нязручных сапернікаў.**



Фота БЕЛТА.

Балельшчыкам на родным стадыёне «Дынама» радавацца не даводзілася. Гледачы, а іх на трыбунах сабралася каля 30 тысяч, падтрымлівалі сваю зборную да фінальнага свістка, пускалі хвалю, скандзіравалі: «Беларусь! Беларусь!», «Нам патрэбны гол!», «Верым у каманду!» Аднак, здаецца, сама каманда ў свае сілы не верыла. Пасля пройгрышу нацыяналкі адзін з фанатаў нават крыкнуў: «Лепей бы «Дынама» выпусцілі на поле!» Абодва галы ў вароты Юрыя Жаўнова забіў Дзімітар Бербатаў на 28-й і 47-й хвілінах сустрэчы. Адправіць мяч у «рамку» так жа класна, як гэта зрабіў нападаючы лонданскага «Тотэнхэма», не маглі нашы форварды Віталь Кутузаў з італьянскай «Пармы» і Сяргей Карніленка з украінскага «Дняпра», а тым больш Вячаслаў Глеб з мінскага МТЗ-РІПА і Раман Васілюк з «Гомеля», якія змянілі іх на полі. Аднак большых папрокаў заслугоўвае наша абарона. У чым жа прычына няўпэўненасці ў дзеяннях каманды?

— Я рыхтаваўся да сустрэчы з балгарамі, але не чакаў, што яны пакажуць такую высакакласную гульню, — паведаміў пасля сустрэчы Юрый Пунтус. — Яны былі хутчэй за нашых у кожным моманце, асноўныя ігракі вытрымалі амаль два таймы без замен. Асабліва вылучаліся сваёй тэхнічнай магутнасцю і гатоўнасцю іх лідары Марцін Петраў (выступае за мадрыдскі «Атлетыка») і Дзімітар Бербатаў. Я ніколі не бачыў, каб столькі памыляліся нашы ігракі — Саша Глеб, Кульчы. Я хачу папрасіць прабачэння ў нашых балельшчыкаў. На стадыёне быў такі ажыятаж, а каманда не змагла перамагчы.

Пры ўсёй павазе да Юрыя Іосіфавіча як да спецыяліста цяжка дапусціць, што ён мог недаацаніць сапернікаў, якія стаяць значна вышэй у рэйтынгу ФІФА за нашу каманду. Магчыма, настаўніка крыху заблытаў вынік матча балгараў з албанцамі (0:0), на якім ён прысутнічаў. «Балгары паставіліся да албанцаў вальяжна, таму і не змаглі размачыць лік», — заўважыў тады Пунтус і пажадаў, каб балгары паставіліся да нашай зборнай так жа. Аднак, здаецца, менавіта мы, а не яны, недаацанілі свайго высакакласнага апанента, тым больш што перад адборачнай сустрэчай на сталічным «Дынама» галоўны настаўнік балгараў Станімір Стойлаў заявіў:

— Перш за ўсё я балгарын і нясу на сабе адказнасць за вынік, нягледзячы на тое, да якога тэрміну ўзначальваю каманду (кантракт з нац. зборнай Балгарыі заканчваецца 7 чэрвеня 2007 г. — **Аўт.**), таму не магу дапусціць іншага завяршэння матча — мы прыехалі толькі пераможцамі.

6 чэрвеня наша каманда зноў згуляе з падначаленымі Станіміра Стойлава, толькі ў гасцях. Сем гадоў таму нашы футбалісты ўжо прайгравалі ў Сафіі ў таварыскім паядынку (1:4).

Вынікі іншых матчаў у групе «G»: Албанія—Люксембург — 2:0, Славенія—Румынія — 1:2. Становішча каманд: Румынія — 14, Галандыя — 14, Балгарыя — 12, Беларусь — 7, Албанія — 6, Славенія — 4, Люксембург — 0.

Група «А»: Казахстан—Арменія — 1:2, Фінляндыя—Сербія — 0:2, Бельгія—Партугалія — 1:2, Азербайджан—Польшча — 1:3. Становішча каманд: Польшча — 19 ачкоў, Партугалія — 14, Сербія — 14, Фінляндыя — 11, Бельгія — 7, Казахстан — 5, Арменія — 4, Азербайджан — 4. Група «В»: Фарэрскія астравы—Італія — 1:2, Літва—Грузія — 1:0, Францыя—Украіна — 2:0. Становішча каманд: Францыя — 15, Італія — 13, Украіна — 12, Шатландыя — 12, Літва — 7, Грузія — 6, Фарэрскія астравы — 0. Група «С»: Боснія і Герцагавіна—Турцыя — 3:2, Нарвегія—Мальта — 4:0, Грэцыя—Венгрыя — 2:0. Становішча каманд: Грэцыя — 15, Турцыя — 13, Боснія і Герцагавіна — 10, Нарвегія — 10, Венгрыя — 6, Мальта — 4, Малдова — 2. Група «D»: Уэльс—Чэхія — 0:0, Германія—Сан-Марына — 6:0. Становішча каманд: Германія — 16, Чэхія — 14, Ірландыя — 13, Славакія — 9, Уэльс — 7, Кіпр — 4, Сан-Марына — 0. Група «Е»: Расія—Андора — 4:0, Македонія—Ізраіль — 1:2, Эстонія—Харватыя — 0:1. Становішча каманд: Харватыя — 16, Расія — 14, Ізраіль — 14, Англія — 11, Македонія — 7, Эстонія — 0, Андора — 0. Група «F»: Ісландыя—Ліхтэнштэйн — 1:1, Латвія—Іспанія — 0:2, Данія—Швецыя — пры ліку 3:3 матч быў спынены, бо дацкі балельшчык ударыў нямецкага суддзю Герберта Фандэля, які выдаліў з поля паўабаронцу гаспадароў Крысціяна Поўльсена і назначыў пенальці ў іх вароты за хвіліну да канца гульні. Становішча каманд: Паўночная Ірландыя — 13, Швецыя — 12, Іспанія — 12, Данія — 7, Ісландыя — 4, Ліхтэнштэйн — 4, Латвія — 3.

***P.S. Маладзёжная зборная Беларусі перамагла венграў у адборачным матчы чэмпіянату Еўропы-2009 — 1:0. Адзіны мяч забіў нападаючы львоўскіх «Карпат» Леанід Ковель.***

**Ірына ПРЫМАК.**

## Узаемадзеянне прэсы і дзяржаўных прэс-службаў абмяркоўваюць па ініцыятыве АБСЕ

**Учора ў Мінску пачаў працу двухдзённы семінар-трэнінг для беларускіх журналістаў і супрацоўнікаў прэс-службаў дзяржаўных устаноў, арганізаваны Бюро прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ пры падтрымцы МЗС Беларусі.**

Мерапрыемства прысвечана ўзаемадзеянню прэсы і дзяржаўных прэс-службаў у дэмакратычным грамадстве. Каментуючы на мінулым тыдні правядзенне мерапрыемства, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС нашай краіны Андрэй Папоў заявіў журналістам, што ініцыятыва семінара-трэнінгу зыходзіла ад прадстаўніка па пытаннях свабоды СМІ Міклаша Харасці. «Беларускі бок дадзеную прапанову падтрымаў», — дадаў прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства.

Выступаючы на адкрыцці семінара ўчора раніцай, Міклаш Харасці адзначыў, што падчас візіту ў Мінск ён плануе абмеркаваць праект Закона «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі» са старшынёй Камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Юрыем Кулакоўскім.

У Сакратарыяце Палаты прадстаўнікоў карэспандэнту «Звязды» пацвердзілі, што сустрэча дэлегацыі АБСЕ з кіраўніцтвам парламенцкай камісіі адбылася ў панядзелак.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

# ПА СЛЯДАХ ПАЛЕССКІХ РАБІНЗОНАЎ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

У тым жа будынку, што і музей, знаходзіца кафэ з цудоўнай беларускай кухняй: багатае на смак заліўное, дамашняя каўбаса, духмяныя бліны... А гэта ўжо значыць, што турызм тут пастаўлены на шырокую нагу, бо пасля доўгай дарогі першае, што патрэбна — гэта перакусіць.

### Ля крыжоў

Тураў — не толькі пачатак турыстычнага маршруту ў «Прыпяцкі». Гэта старажытны культурны і духоўны цэнтр, сталіца княства, якая дала свету трох святых — свяціцеляў Кірыла і Лаўрэнція і затворніка Марціна Тураўскіх. У XII ст. тут было каля 80 цэркваў і пяць манастыроў! Нездарма і сёння сюды едуць паломнікі з розных куткоў Беларусі — памаліцца ля крыжоў, якія, згодна з паданнем, прыплылі па Дняпры і Прыпяці супраць цячэння з Кіева і сёння знаходзяцца ў Царкве Усіх Святых. Яшчэ адна тураўская святыня — Цуда-крыж на Барыса-Глебскіх могілках. Згодна з паданнем, тут былі забіты Святаполкам сыны кіеўскага князя Уладзіміра — Барыс Растоўскі і Глеб Мурамскі. Крыж быў знойдзены 12 гадоў таму ў старой частцы могілак, таму тураўцы адразу паставіліся да яго з вялікай пашанай — магчыма, гэта магіла альбо святога Марціна, альбо самога Кірылы Тураўскага. Хутка тураўцы заўважылі, што камень... расце. Штогод ён робіцца большым на адзін сантыметр у вышыню. Навукоўцы тлумачаць гэта тым, што зямля, магчыма, выштурхоўвае крыж вонкі. Але нядаўна было заўважана, што крыж расце таксама і ўшыркі.

— Калі б я збіраў усе выпадкі вылечвання праз гэты камень-крыж, — расказаў староста царквы Усіх Святых Валерый Катлярчук, — то хапіла б на кнігу. Але сведкам некаторых з'яўляюся сам. Паралізаванай жанчыне з Мінска прысніўся сон, што яна атрымае палёгку, прыехаўшы ў Тураў да гэтага крыжа. Сын прывёз яе, але несці ад уваходу да крыжыка было далекавата, таму ў другі раз ён з унутранага боку могілак адкрыў браму і заехаў туды на машыне. Жанчыны-тураўчанкі, якія там былі, пачалі яго папракаць, і пакуль ён апраўдваўся, дзверцы машыны адчыніліся і... выйшла маці. Ці не цуд гэта?

З 2001 па 2007 год каменны крыж, сцвярджае царкоўны староста, выйшаў з зямлі на 5 сантыметраў. У 2004 годзе зрабілі замер яго крылаў, яны былі 28 сантыметраў. Зараз — 31.

Увогуле, падчас паездкі, усе, у каго б мы ні пыталіся пра Цуда-крыж, экскурсавода альбо егера (чалавека, які, здавалася, найменш зацікаўлены ў падтрыманні мясцовых легендаў), рабіліся больш сур'ёзнымі, нешматслоўнымі і пацвярджалі, што сапраўды ўсё так і ёсць — крыж расце, вылучае цеплыню, нават снег зімой на ім растае, і многія людзі, якія прыязджаюць альбо прыходзяць да яго памаліцца, вылечваюцца. Мы, журналісты, зрабілі ўсё, як параіла нам Алена Жураўская: знялі нацельныя крыжыкі, паклалі на крыж, потым па чарзе нахіліліся над ім, апусціўшы рукі, і паспрабавалі ні пра што не думаць... Некаторыя сапраўды адчулі цеплыню, якая зыходзіла ад каменя. Былі і такія, што нічога не адчулі, і не паверылі, і сумняваліся. Спадзяюся, што нябесныя апекуны зямлі Беларускай даруюць турыстам іх немалітоўны настрой. Ва ўсякім разе асабіста я пакідала могілкі з дзіўным светлым пачуццём у душы. Алена Жураўская сказала, што тое самае яна адчувае кожны раз.

Тут жа, побач з могілкамі, знаходзіцца і падмурак першага каменнага сабора ў Тураве. 3 мая 1230 года храм сышоў пад зямлю, як мяркуюць, ад хваляў балканскага землятрусу. У 2005 годзе былі закончаны раскопкі сабора пад кіраўніцтвам Пятра Лысенкі. За час раскопак былі знойдзены сем каменных саркафагаў. Два з іх знаходзяцца ў храме дагэтуль. Зараз на месцы раскопак створаны помнік «Скрыпта». Але гэта не проста рэшткі царквы, і не проста помнік. Перш за ўсё — гэта жывы храм, бо ў дзень памяці Кірылы Тураўскага і іншыя святы тут служыць Літургію Мітрапаліт Філарэт у саслужэнні епіскапаў.

Такім чынам, Тураў — асаблівае месца, не толькі надзвычай прыгожае, але поўнае сапраўдных цудаў і тайнаў. Тураў глыбокі, як бяздонны калодзеж. Самі тураўцы жывуць там і ўвесь час даведваюцца новае пра свой горад.

### У краіне пойменных дубраў

Дарога з Турава вядзе ў Нацыянальны парк «Прыпяцкі»: палі, дзе збожжавыя даюць да 120 цэнтнераў з гектара, рака Сцвіга, некалькі вёсачак, жыхары якіх прызвычаіліся жыць сярод вады, хаты, якія ўпускаюць у сябе раку раз у пяць гадоў, лодкі і чаўны, не толькі ля хат, але і ля дарог, сцежак, градак, лесу, па некалькі на кожным узвышшы, — чакаюць свайго часу.

Вёскі, якія знаходзяцца на тэрыторыі «Прыпяцкага» — таксама паркавая гаспадарка. Кіраўніцтва нясе адказнасць і за занятасць іх жыхароў, і за сацыяльную абарону апошніх.

— Людзі тут навучыліся жыць у гармоніі з прыродай, — кажа генеральны дырэктар нацыянальнага парку Сцяпан Бамбіза, сам ураджэнец гэтых мясцін. — І мы вучымся спалучаць гаспадарчую дзейнасць парку з прыродаахоўнай: выводзім пасяўныя плошчы з ахоўных тэрыторый, забараняем выпас свойскай жывёлы. Разам з тым ствараем новыя працоўныя месцы — цяпер іх больш за 2000 і кожны год прыбаўляецца каля ста. Але на першым плане — прырода. Па біяразнастайнасці нашым мясцінам няма роўных у Еўропе. За апошнія 5 гадоў тут разам з навукоўцамі Акадэміі навук было адкрыта больш за 100 відаў раслін, пра існаванне якіх на Палессі не было вядома. І работа гэта працягваецца, мяжы яе не бачна.

Парк цікавы для вучоных з усяго свету. Пяць гадоў сюды прыязджаюць галандскія эколагі, заклапочаныя аднаўленнем Рэйна — даліна Прыпяці з'яўляецца эталонам некранутай экасістэмы. Нядаўна адсюль з'ехала міжнародная група вучоных, якая рыхтуе даклад пра Нацыянальны парк для Савета Еўропы. Паглядзець на пойменныя дубы, якія мільёнамі гадоў прыстасоўваліся да затаплення і якія могуць трываць у вадзе каля паўгода, пачынаючы з жолуда і кволага парастка, прыязджаюць не толькі з Еўропы, але і з-за акіяна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*(Заканчэнне будзе.)*

# ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ «ДЗВЮХ ЗОРАК»

## Жадаючыя «пагаласіць» зноў аб'явяцца ўвосень

Закуліссе

**Можа, тэлепраект АНТ «Дзве зоркі» ўсім і надакучыў, як заяўлялі многія гледачы, але па гала-канцэрту, які прайшоў у Палацы Рэспублікі, гэтага не скажаш. Народу ў зале было дастаткова — ва ўсякім разе, не менш, чым на звычайных «зборных» праграмах. Прычым калі частка людзей прыйшла па запрашальніках і рэагавала на падзеі не вельмі жвава, то тыя, хто набыў білеты, з'явіліся з кветкамі і фотаапаратамі, а на выступленні ўпадабаных дуэтаў не шкадавалі далоняў.**

Зрэшты, як усё адбывалася на сцэне, будзе бачна ў тэлеверсіі — як запэўніў Ягор Хрусталёў, яе АНТ пакажа праз два тыдні. А самае цікавае, як звычайна, праходзіла за кулісамі, дзе артысты нервова чакалі свайго выхаду і горача перажывалі за іншых — цяпер ужо не канкурэнтаў, а «саўдзельнікаў».

У праграме мы са здзіўленнем заўважылі дуэт Дзмітрыя Качароўскага і Наталлі Наважылавай, якія, паводле папярэдняй інфармацыі, у спісах не значыліся. Аказваецца, тэлевізійнікі абмяняліся афіцыйнымі пісьмамі з Фінбергам (Дзіма Качароўскі — якраз саліст Нацыянальнага дзяржаўнага канцэртнага аркестра), і той усё ж даў згоду на ўдзел свайго артыста ў канцэрце. І гэта пры тым, што гала-канцэрт суправаджаў Прэзідэнцкі аркестр, які з аркестрам Фінберга, мякка кажучы, не сябруе...

А вось народны артыст Беларусі Мікалай Скорыкаў застаўся верным свайму абяцанню і на сцэну не выйшаў. Ён, кажуць, дагэтуль крыўдуе на тэлеканал — не верыць, што за іхні дуэт з дырэктарам Белдзяржцырка прагаласавалі толькі 2 тысячы чалавек. Яго партнёрша, Таццяна Бандарчук, дэмарш падтрымала, хоць ёй і прапаноўвалі выступіць з кімсьці іншым.

Для Вікторыі Алешкі **(на фота)**, наадварот, адсутнасць у Мінску партнёра па тэлепраекту Алеся Мухіна праблемай не стала. Літаральна за дзень яна адрэпеціравала дуэт з вядучым АНТ Яўгенам Лашкоўскім. Таму давялося праявіць цуды спрыту і лоўкасці, каб паспець пераапрануцца, выступіць, зноў змяніць за сцэнай касцюм і як ні ў чым не бывала заняць месца вядучага гала-канцэрта «Дзвюх зорак».

Дарэчы, Алешка была адной з нямногіх выступоўцаў, хто, здаецца, зусім не нерваваўся — блукала за кулісамі з анёльскай усмешкай. Для гэтага ёсць усе падставы: тыдзень таму Віка выйшла замуж за калегу па сцэне, саліста Маладзёжнага тэатра эстрады Дзмітрыя Сяргеева.

— Мы свае адносіны не хавалі, але і не афішавалі, — расказала Вікторыя Алешка. — У тэатры, дзе мы абодва працуем, усе ўсё даўно ведалі — мы ўжо тры гады разам, ды і на гастролях даўно жылі ў адным нумары. Так што і вяселле было сціплае такое. У вясельнае падарожжа, натуральна, хацелася б з'ездзіць, тым больш зараз такое цудоўнае надвор'е... Але ў нас будзе вялікі гастрольны тур «За Беларусь», ён працягнецца да 3 ліпеня, там адразу пачнецца «Славянскі базар». У прынцыпе, мы вельмі спадзяёмся на жнівень, марым паехаць у круіз на лайнеры.

Спявачка сцвярджае, што яны з мужам адно аднаго цудоўна разумеюць, дапамагаюць і нават робяць тое-сёе разам: у іх ёсць тры дуэты. «Але наўрад ці мы станем такім дуэтам і на сцэне і ў жыцці, як Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, кожны працягне сваю сольную кар'еру», — мяркуе Віка.

Пакуль Алешка дзялілася радасцямі сямейнага жыцця, у калідорчыку разносіўся прыемны барытон. Гэта распяваўся Жэня Булка, рэпеціруючы сваю партыю Разанава з рок-оперы «Юнона» і «Авось». Увогуле, спяваючы рэзідэнт «Камедзі Клаб» дзіўным чынам паспяваў усё — і ўдакладніць чаргу свайго выхаду на сцэну, і паспяваць, і пажартаваць, і паспрабаваць сесці на шпагат, і сфатаграфавацца з прыхільнікамі, якія невядомымі шляхамі прасачыліся за кулісы. І яшчэ пакрычаць грамавым голасам з аднаго канца калідора ў другі: «Я спако-ойны!».

Аляксей Хлястоў апошнім часам ходзіць у Палац Рэспублікі, як на працу — літаральна днямі тут адбыўся трэці сольны канцэрт артыста, на арганізацыю якога спатрэбілася надта многа сіл і людзей. Пры ўсіх праблемах здараліся і забаўныя сітуацыі: незадоўга да пачатку праграмы ледзьве не згубіліся штаны ад канцэртнага касцюма спевака. «Давялося б выйсці ў пінжаку і трусах», — сумна жартуе Аляксей. Дарэчы, на «сольніку» ўпершыню прагучала новая песня Хлястова «Дзве зоркі», але да аднайменнага тэлепраекта яна ніякага дачынення не мае — проста прыгожы дуэт.



Жанэт і Генадзь Давыдзька пакінулі свае грымёркі толькі дзеля выхаду на сцэну і агульнай фінальнай песні, а потым зноў схаваліся за дзвярыма. Спявачка была чымсьці відавочна расстроеная, практычна ні з кім не размаўляла. Калі Папялушка, збягаючы з балю, пакінула на лесвіцы туфлік, то ў дадзеным выпадку праз нейкі час за кулісамі мы ўбачылі бела-блакітны валёнак, вельмі падобны па стылю да «Снягуркінага» канцэртнага ўбору Жанэт.

Прадзюсар АНТ Ягор Хрусталёў, як хлопчык, стаяў за бакавымі парцьерамі і ўсхвалявана адсочваў кожны дуэт, ад Ілы Міцько і Элеаноры Язерскай да Таццяны Рудакоўскай і Яўгена Лашкоўскага. Толькі потым, пераканаўшыся, што ўсё прайшло як след, даў некалькі каментарыяў.

**— Ягор Вячаслававіч, працяг шоў «Дзве зоркі», кажуць, ужо рыхтуецца?**

— Так, ён пачнецца ў новым вяшчальным сезоне, хутчэй за ўсё, з тым разлікам, каб завяршыць бліжэй да Новага года і зрабіць відовішчнае фінальнае шоў. Некалькі пар мы ўжо прыдумалі. Але свабодных «вакансій» таксама хапае. Прынцып падбору дуэтаў будзе той жа самы: адзін прафесійны выканаўца і адзін непрафесіянал, папулярны чалавек, які дасягнуў поспехаў у сваёй сферы. (Гэта Хрусталёў тлумачыць ужо не толькі журналістам, але і нейкаму актыўнаму гледачу, які выказаў жаданне запісацца на наступнае шоў. — **Аўт.**). Што датычыцца вядучага, журы — пакуль не ведаю. Анатоль Іванавіч Ярмоленка, напрыклад, прапаноўваў свае паслугі — папрацаваць разам з Вольгай Сярожнікавай у артыстычным бары.

**— У Расіі пары складаліся не толькі па прынцыпу «мужчына—жанчына», быў, напрыклад, яркі дуэт Сярогі і Жыраноўскага. У нас аднаполых дуэтаў не прадбачыцца?**

— Чаму ж, у нас ёсць такая прапанова, але гэта будзе вельмі вялікі скандал, таму падрабязнасцяў я пакуль не раскрыю.

**— Хутка у АНТ дзень нараджэння. Што ў сувязі з гэтым плануецца?**

— Будзе шэсць вялікіх канцэртаў, у тым ліку традыцыйная «Ноч агню» ў Мірскім замку і «Купалле Ірыны Дарафеевай». Таксама падрыхтавана некалькі відовішчных і яркіх тэлепраектаў — вось гэты гала-канцэрт, вялікі фестываль «Камедзі Клаб», выступленне каманды КВЗ «ЧП»... Словам, у нас увесь чэрвень будзе вельмі насычаны.

**— Ходзяць упартыя чуткі, што акрамя «Дзвюх зорак-2», АНТ раздумвае над закупкай фармату тэлешоў «Кароль рынгу»...**

— Мы абмяркоўвалі гэта пытанне, і пакуль вырашылі адмовіцца ад гэтай ідэі. Па-першае, у нас сегмент людзей, якія захапляюцца менавіта боксам, вельмі невялікі — значыць, глядацкая аўдыторыя праекта будзе недастатковай. Дый вопыт нашых калег з «ЛАДу», якія рабілі ў Сілічах «Цудоўную сямёрку», паказаў, што спартыўныя праекты трэба рабіць альбо вельмі маштабнымі і яскравымі, альбо не рабіць увогуле. Па-другое, на наступны сезон мы падрыхтавалі два іншыя праекты, абсалютна новыя, якія не ішлі на расійскіх каналах... Але ўсяму свой час.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.42 | 21.35 | 16.53 |
| Віцебск — | 4.23 | 21.33 | 17.10 |
| Магілёў — | 4.32 | 21.25 | 16.53 |
| Гомель — | 4.37 | 21.13 | 16.36 |
| Гродна — | 4.58 | 21.49 | 16.51 |
| Брэст — | 5.08 | 21.40 | 16.32 |

### Месяц

*Апошняя квадра 8 чэрвеня*
*Месяц у сузор'і Рыб*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Андрэя, Івана, Канстанціна, Міхаіла, Пятра, Фёдара, Якава*
**К.** *Валерыя, Зінаіды, Кіры, Баніфата, Дарафея, Ігара*

По звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

**Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 05.06.2007**

Для бязвоблачнага неба — UV INDEX 6,3
З улікам прагназуемай воблачнасці — UV INDEX 6,3

| | |
|---|---|
| Экстрэмальны | 11+ |
| Вельмі высокі | 8—10 |
| Высокі | 6—7 |
| Умераны | 3—5 |
| Нізкі | 1—2 |

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **20 мінут**.

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| **ВАРШАВА** | +24 — +26 °С | Без ападкаў |
| **ВІЛЬНЮС** | +24 — +26 °С | Без ападкаў |
| **КІЕЎ** | +21 — +23 °С | Без ападкаў |
| **МАСКВА** | +21 — +23 °С | Без ападкаў |
| **РЫГА** | +23 — +25 °С | Без ападкаў |
| **С-ПЕЦЯРБУРГ** | +22 — +24 °С | Без ападкаў |

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у тэрмін з 5 чэрвеня 2007 года па 6 ліпеня 2007 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі.

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд Гульні фарміруецца за кошт чыстага прыбытку Арганізатара Гульні.

4. У склад Прызавога фонду Гульні ўваходзяць:
7 маек Regent,
7 бейсболак «Стандарт»,
7 наручных кварцавых гадзіннікаў з лагатыпам «Звязда»,
мікрахвалевая печ HORIZONT 17MW700-1379,
адзін тэлевізар «Віцязь» 37CTV730-3, г. Віцебск,
халадзільнік MXM2808-00 Мінск, ЗАО «АТЛАНТ».
УСЯГО прызавы фонд Гульні складае 1 405 092 (Адзін мільён чатырыста пяць тысяч дзевяноста два) беларускія рублі.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ. ПАРАДАК АДБОРУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ**

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на 3-і квартал або шэсць месяцаў II паўгоддзя 2007 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпісной кампаніі на 3-і квартал і II паўгоддзе 2007 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца да двух разоў у тыдзень у перыяд з 5 па 27 чэрвеня 2007 года ўключна ў тым жа сродку масавай інфармацыі, у якім былі апублікаваны гэтыя Правілы.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або дасланыя пасля 2 ліпеня 2007 года па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенню рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (надалей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 5 чэрвеня 2007 года па 6 ліпеня 2007 года ў складзе пяці чалавек.

10. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца падпісчыкі газеты або прадстаўнікі незалежных арганізацый.

11. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

12. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца рашаючым.

13. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

14. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 5 ліпеня 2007 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасу: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

15. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і гораду Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

16. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па 1 майцы Regent, па 1 бейсболцы і па 1 наручнаму гадзінніку з лагатыпам газеты «Звязда».

17. Выйграўшым прыз лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча ўказана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышу кожнага асобнага прыза выцягне наўздагад са скрыні хто-небудзь з падпісчыкаў або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка ўказваецца выйграны прыз і распісваюцца члены камісіі.

18. Для розыгрышу мікрахвалевай печы, тэлевізара «Віцязь» і халадзільніка «Атлант» усе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне выйграўшых удзельнікаў адбываецца ў парадку, які ўстаноўлены пунктам 17 гэтых Правілаў.

19. Удзельнікам, якія выйгралі прызы, Арганізатар на працягу 10 дзён з дня правядзення розыгрышу дасылае паведамленні аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

20. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 3-і квартал або II паўгоддзе 2007 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 3-і квартал або II паўгоддзе 2007 года.

21. Выдача прызоў (акрамя мікрахвалевай печы, тэлевізара і халадзільніка) ажыццяўляецца ў тэрмін да 20 верасня 2007 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасу: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

22. Дастаўка і ўручэнне мікрахвалевай печы, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін да 20 верасня 2007 года ўключна з паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў сродках масавай інфармацыі.

Іншыя прызы могуць быць дастаўлены грамадзянам, якія іх выйгралі, па ўзгадненню з Арганізатарам і пры ўмове іх пражывання ў мясцовасці, блізка размешчанай ад мясцовасці пражывання грамадзян, якія выйгралі мікрахвалевую печ, тэлевізар або халадзільнік.

23. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

24. Пасля 20 верасня 2007 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

25. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

26. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, пісьмы і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

27. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», склад камісіі па яе правядзенню, памер і склад прызавога фонду да пачатку Гульні падлягаюць апублікаванню сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

28. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 17 ліпеня 2007 года ўключна ў тым жа сродку масавай інфармацыі, у якім былі апублікаваны гэтыя Правілы.

29. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 729 ад 29.05.2007 выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

# МАЛЮНКІ ДА «ПЕКЛА» ЕДУЦЬ З ІТАЛІІ

Выстаўкі

Што чакае нас пасля?.. Пытанне, якое разгадвала чалавецтва стагоддзямі ды так і не ведае дакладны адказ на яго. Але самая распаўсюджаная версія прымусіла многіх людзей змяніць сваё жыццё. І натхніла выдатных мастакоў на бессмяротныя творы. І ў трэцім тысячагоддзі натхняе таксама. Італьянскі мастак Марка Карна ўвасобіў словы «Боскай камедыі» Дантэ. Над стварэннем цыкла графічных работ ён працаваў з 1953 па 1993 год. А ў Мінску з імі можна будзе знаёміцца толькі дваццаць дзён, пачынаючы з 5 чэрвеня.

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва гэтай выставай робіць вялікую асветніцкую справу. Таму што гэта — магчымасць адначасова дакрануцца да мастацтва візуальнага і мастацтва слова. Вобразам самога Дантэ Аліг'еры прасякнуты ўвесь графічны цыкл мастака, які для твораў абраў частку «Пекла» з «Боскай камедыі». Ілюстрацыі Марка Карна тлумачаць тэкст літаратурнага твора XIV стагоддзя. Але мастак у іх адначасова незалежны філосаф, які суперажывае літаратурным правобразам, ён надае больш увагі самому асяроддзю, у якім знаходзяцца персанажы. Ён, па сутнасці, распавядае біяграфію чалавечага духу XX стагоддзя.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ЗВЕСТКІ аб складзе і памеры прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду»

Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт чыстага прыбытку арганізатара гульні — установы «Рэдакцыя газеты «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць | Цана за адзінку (руб.) | Кошт (руб.) | Стаўка ПДВ (%) | Сума ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Майкі Regent | 7 шт. | 10892 | 76244 | 18 | 13724 | 89968 |
| 2. | Бейсболкі "Стандарт" | 7 шт. | 6586 | 46102 | 18 | 8298 | 54400 |
| 3. | Гадзіннікі наручныя кварцавыя з лагатыпам "Звязда" | 7 шт. | 13285 | 92995 | 18 | 16739 | 109734 |
| 4. | Мікрахвалевая печ HORIZONT 17MW700-1379 | 1 шт. | 166150 | 166150 | 18 Стаўка ПП 5% | 29907 9803 | 205860 |
| 5. | Тэлевізар "Віцязь" 37CTV730-3, г. Віцебск | 1 шт. | 209000 | 209000 | | | 209000 |
| 6. | Халадзільнік MXM2808-00 Мінск, ЗАО "АТЛАНТ" | 1 шт. | 623839 | 623839 | 18 | 112291 | 736130 |

## СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

1. Здановіч Уладзімір Аляксандравіч
намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»

2. Доўнар Валянціна Аркадзьеўна
загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»

3. Ляўковіч Таццяна Уладзіміраўна
вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»

4. Дабравольскі Анатоль Васільевіч
вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»

5. Дзевойна Алена Уладзіміраўна
рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

**Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 5 чэрвеня 2007 года па 6 ліпеня 2007 года.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул.Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, мікрахвалевую печ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 2 ліпеня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 ліпеня 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 верасня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

### 2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на III кв. або II паўгоддзе 2007 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

## 5 чэрвеня

Дзве даты

***Дзень памяці прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай.***

**1173 год** — памерла Ефрасіння Полацкая (Прадслава), полацкая княжна, асветніца, беларуская святая. На ўласныя сродкі яна пабудавала дзве царквы ў Полацку, заснавала жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі цэнтрам асветы ў Полацку. Намаганнямі прападобнай Ефрасінні быў створаны ўнікальны шэдэўр старажытнабеларускага мастацтва — крыж, названы яе імем. Завяршэннем яе жыцця стала паломніцтва ў Іерусалім, у час якога Ефрасіння Полацкая і памерла. Была пахавана ў манастыры на Святой зямлі. У 1187 годзе яе мошчы былі перавезены ў Кіева-Пячорскую лаўру, а ў 1910 годзе — у Полацк, дзе знаходзяцца і зараз.




**8499 год да н.э.** — згодна з некаторымі тэорыямі, у гэты дзень у Атлантычны акіян упаў вялікі астэроід, у выніку чаго загінула Атлантыда. Гэты востраў, які, як мяркуецца, знаходзіўся на захад ад Гібралтара, апісаў у сваіх працах старажытнагрэчаскі гісторык Платон. Аднак пытанні аб існаванні і гібелі Атлантыды ў навуцы застаюцца спрэчнымі.

Цытата дня

***«Адна-адзіная ўсмешка імгненна павялічвае прыгажосць Сусвету».***
**Шры Чынмон.**

**Згубленае пасведчанне інваліда серыі 09 № 367909** на імя Хаміцэвіча Анатолія Якаўлевіча **лічыць несапраўдным.**

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрас)

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2007 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрас)

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл/факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.341. Індэкс 63850. Зак. № 3022. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# ПЕРСПЕКТЫВА — ЗА ЎНІКАЛЬНЫМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ

## На Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў развіваюць сучасную вытворчасць




Дырэктар Нясвіжскага завода медыцынскіх прэпаратаў Сяргей ПРАСМЫЦКІ.

**Развіццё эканомікі немагчымае без актыўнага ўкаранення найноўшых распрацовак, паколькі менавіта яны, у рэшце рэшт, шмат у чым вызначаюць канчатковы вынік. Нездарма ў нашай краіне апраўдана робіцца акцэнт на інавацыйны, рэсурсазберагальны падыход. Пры гэтым надзвычай актуальнай праблемай з'яўляецца мадэрнізацыя вытворчасці — адпаведнае пытанне надзённае для шэрагу айчынных прадпрыемстваў. Дарэчы, неабходная работа ў гэтым накірунку праводзіцца досыць актыўна, праўда, не заўсёды тымі тэмпамі, якімі хацелася б. А адставаць тут нельга, паколькі вельмі хутка можна згубіць свой узровень і апынуцца ў ролі аўтсайдара. Ва ўмовах рынку ў такім разе амаль немагчыма будзе аднавіць страчаныя пазіцыі, бо адпаведную нішу адразу зоймуць больш спрытныя вытворцы.**

**Прычым такія даволі жорсткія (аднак справядлівыя) правілы дзейнічаюць у дачыненні як да асобных суб'ектаў гаспадарання, так і ўсёй эканомікі ўвогуле. Вырабіць канкурэнтаздольную прадукцыю і выгадна рэалізаваць яе — задача нумар адзін для кожнага вытворцы. Аднак выканаць намечанае не так проста, для гэтага неабходна стварыць належныя ўмовы. Прапаноў на рынку шмат і спажывец выбірае найбольш прываблівы для сябе, арыентуецца па суадносінах цаны і якасці. Таму прадпрыемствы павінны забяспечыць сучасны ўзровень вытворчасці, маючы на ўвазе адзін з важнейшых тут рэзерваў — змяншэнне затрат. Такі шлях магчымы толькі пры ўмове выкарыстання сусветнага вопыту, паколькі найноўшыя распрацоўкі ці не ў першую чаргу скіраваны менавіта на энерга- і рэсурсазберажэнне. Дарэчы, многія кіраўнікі айчынных прадпрыемстваў цудоўна разумеюць перспектыўнасць інавацый, таму зразумела, што мадэрнізацыя вытворчых аб'ектаў, як правіла, праводзіцца на самым сучасным узроўні.**

**Напрамую гэта датычыцца фармацэўтычнай галіны, паколькі прадукцыя, якую выпускаюць адпаведныя прадпрыемствы, без перабольшання жыццёва неабходная для людзей. Попыт на яе традыцыйна вялікі, трэба яго задаволіць у поўнай меры. Не менш важная задача — якасць прадукцыі. Паколькі гаворка ідзе пра здароўе чалавека, то пытанне смела можна аднесці да разраду стратэгічных. Нездарма развіццё фармацэўтычнай галіны заўсёды ў цэнтры ўвагі. Апошнім часам тут адбываюцца сапраўды кардынальныя змяненні, асноўная мэта якіх — высокі ўзровень вытворчасці, адпаведнай сусветнаму. Выгада атрымліваецца ўзаемная: і для прадпрыемстваў, і для спажыўцоў. У фармацэўтычнай галіне актыўна рэалізуюцца маштабныя інвестыцыйныя праекты, на мадэрнізацыю асноўных фондаў накіроўваюцца вялікія сродкі. Адзін з найбольш значных такіх праектаў уасабляецца ў жыццё на Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў. Можна нават сцвярджаць, што прадпрыемства зараз на мяжы, бадай, аднаго з важнейшых этапаў у гісторыі свайго развіцця. Прычым паспяховая рэалізацыя адпаведнага інвестыцыйнага праекта дазволіць у далейшым распаўсюдзіць набыты пры гэтым карысны вопыт. Вельмі цікава было паглядзець, як гэтая справа зараз разгортваецца на Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў, стаць сведкам укаранення ўнікальных тэхналогій. Таму мы і накіраваліся на вядомае прадпрыемства, убачыць і пачуць тут давялося шмат. Аднак аб усім па парадку...**

### На скрыжаванні стагоддзяў

Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў мае багатую гісторыю. Для Нясвіжа, які яшчэ Караткевіч называў «горадам-помнікам», гэта вельмі характэрна. Тут літаральна ўсё нагадвае пра цікавыя гістарычныя падзеі, паданні і таямнічыя легенды. А Альба (у гэтым пасёлку, што ў ваколіцах Нясвіжа, і размешчаны завод) — знакамітая мясціна. У свой час Радзівілы стварылі тут сваю загарадную рэзідэнцыю. Вельмі прыгожа і велічна ўсё атрымалася! На гэта князя Радзівіла Сіротку натхніў адзін са старажытнейшых гарадоў Еўропы — Альба (у перакладзе з італьянскай — світанак, пачатак), дзе яшчэ ў імператарскія часы размяшчаліся загарадныя вілы рымскіх патрыцыяў. На Нясвіжчыне ўсё было створана не менш грандыёзна: на плошчы каля 300 гектараў на правым беразе Ушы быў сфарміраваны архітэктурна-паркавы комплекс. Буйнейшы ў Беларусі. Палацы, феерверкі, каналы — усё гэта таксама пра айчынную Альбу. З цягам часу будынкі і паркі прыйшлі ў заняпад, на пачатку мінулага стагоддзя ў былой рэзідэнцыі засталіся хіба толькі гаспадарчыя пабудовы. Кажуць, што ў 1910-м гаспадарам прыйшла ідэя стварыць тут бровар — невялічкі спіртзавод.

Так у Альбе «пачалася» прамысловасць. Першапачатковае прызначэнне вытрымлівалася на працягу амаль паўстагоддзя: у 1960-м на базе Альбянскага спіртавога завода быў заснаваны Нясвіжскі завод кармавога біяміцыну (у 1985 г. назва змянілася на Нясвіжскі біяхімічны завод, а з 1991-га — гэта Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў).

Спачатку прадпрыемства працавала амаль выключна на патрэбу сельскай гаспадаркі — быў наладжаны выпуск кармавога антыбіётыку — біяміцыну. Спачатку вытворчая магутнасць складала 4 тоны, а пасля дасягнула 43. У 1983 годзе на заводзе пабудавалі новы цэх, дзе пачалі выпускаць рызатарфін (экалагічна чыстае ўгнаенне) і біякансервант біясіл. А ў 1985-м тут асвоілі выпуск прэпарату баліз. Усе накірункі дзейнасці адпрацоўваліся зыходзячы яшчэ з саюзных маштабаў — вядома, што на вялізнай тэрыторыі паміж рэспублікамі і асобнымі рэгіёнамі на працягу дзесяцігоддзяў адпрацоўвалася дакладная кааперацыя. Так было і з прадукцыяй, якую выпускаў Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў, са збытам праблем не ўзнікала. Яны з'явіліся якраз у пачатку 1991 года, калі былыя сувязі былі парушаны і кожнаму з былых партнёраў давялося шукаць выйсце самастойна. Неабходна было зрабіць менавіта такі крок, які б надзейна вызначаў перспектыву для прадпрыемства. На Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў і зараз з асаблівым пачуццём узгадваюць год 1992-і, калі тут было праведзена тэхнічнае пераўзбраенне, у выніку чаго з'явілася новая спецыялізацыя — выпуск раствораў для ін'екцый. Першапачатковая магутнасць гэтай вытворчасці складала 700 тысяч бутэлек у год. Такое рашэнне аказалася сапраўды апраўданым — правільнасць абранага шляху развіцця пацверджана часам. Ужо праз два гады, у 1994-м, аб'ём вытворчасці ін'екцыйных раствораў павялічыўся больш чым удвая і дасягнуў 1,8 млн бутэлек. На мяжы стагоддзяў (у 2000 г.) гадавая магутнасць дасягнула 4,5 мільёна бутэлек. Сімвалічна, хіба не так? Менавіта тады і была зацверджана цяперашняя назва — Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў». Зноў-такі гістарычная мяжа, якая ў пэўным сэнсе стала зыходным пунктам далейшага перспектыўнага развіцця.

З лістапада мінулага года Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў узначальвае Сяргей Прасмыцкі. Сяргей Сяргеевіч — малады, ініцыятыўны кіраўнік. Ён скончыў Мінскі дзяржаўны вышэйшы лётна-тэхнічны каледж, а пасля — Беларускі камерцыйны інстытут кіравання па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве». Больш чым дзесяць гадоў Сяргей Сяргеевіч адпрацаваў на Гарадзейскім цукровым камбінаце: інжынерам аддзела маркетынгу, начальнікам аддзела чыгуначнага транспарту, а пасля — начальнікам цэха чыгуначнага транспарту. З 16 лістапада 2006-га — дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў».

— Прадпрыемства ўпэўнена рухаецца наперад, паступальна нарошчваючы аб'ёмы вытворчасці, — заўважае Сяргей Прасмыцкі. — Гэты паказчык за мінулы год дасягнуў узроўню 17,5 мільёна бутэлек. У параўнанні з першапачатковай магутнасцю рост аказаўся вельмі значны: з 700 тыс. — да 17,5 млн! Калі параўноўваць гэтыя лічбы, то становіцца зразумелым, што вызначаны ў пачатку 1990-х вектар развіцця аказаўся адзіна правільным курсам, стратэгічнай перспектывай, здольнай і надалей развіваць слаўную гісторыю прадпрыемства. І падкрэсліць адметнасць цудоўнага мястэчка — беларускай Альбы. Для гэтага варта прыкласці ўсе намаганні.

### Буйнейшы вытворца

Зараз на Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў выпускаецца больш чым дваццаць найменняў стэрыльных, інфузійных і ін'екцыйных раствораў розных фармакатэрапеўтычных груп у шкляных бутэльках. Сярод іх — сродкі вуглевадароднага харчавання, прэпараты для карэкцыі водна-солевага балансу і ўстанаўлення іоннай раўнавагі, дэзінтаксацыйныя кровазамяняльнікі, рэгідратацыйныя прэпараты, мясцованестэзуючыя і антыбактэрыяльныя сродкі, а таксама кансерванты крыві і іншыя. Ёсць магчымасць пашыраць асартымент за кошт павелічэння відаў дазіровак: па заказах спажыўцоў можна вырабляць лекавыя сродкі ў бутэльках ёмістасцю 50 і 100 мілілітраў раствору. Трэба мець на ўвазе тое, што Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў з'яўляецца буйнейшым у нашай дзяржаве вытворцам інфузійных раствораў — агульную штогадовую патрэбу ў 24—27 мільёнаў бутэлек прадпрыемства забяспечвае больш чым на 2/3. Пэўная частка выпушчанага адгружаецца і за мяжу — геаграфія паставак ахоплівае шэраг краін на постсавецкай прасторы. Экспарт, хоць і з цяжкасцямі, аднак развіваецца — напрыклад, апошнім часам удалося палепшыць эканамічныя паказчыкі па гандлю з Расіяй.

Абраную некалі спецыялізацыю на Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў змяняць не плануюць, аднак на працягу шэрагу гадоў акрэслілася пэўная праблема. Павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці — гэта, канешне ж, станоўчы факт, які сведчыць аб перспектыве прадпрыемства, яго жыццяздольнасці. Тым больш, што прадукцыя заўсёды запатрабаваная ў спажыўцоў. І галоўным сваім рынкам прадпрыемства апраўдана лічыць менавіта рынак айчынны. Аднак у Нясвіжскага завода медыцынскіх прэпаратаў тут узнікае складаная сітуацыя.

— Справа ў тым, што падраздзяленні Міністэрства аховы здароўя разліваюць тыя ж інфузійныя растворы ў аптэках і бальніцах, — адзначае Сяргей Прасмыцкі. — Зразумела, што адбываецца гэта далёка не ў тых умовах, як належыць тое рабіць, у выніку чаго на айчынным рынку ствараецца незразумелая канкурэнцыя: прадпрыемства, дзе адладжаны вытворчы працэс і вытрымліваюцца ўсе неабходныя параметры па якасці, па сутнасці адчувае вялікія цяжкасці з рэалізацыяй прадукцыі. Хіба гэта па-дзяржаўнаму? Канешне ж не. Разуменне праблемы існуе, пацвярджэннем таму з'яўляецца пастанова Міністэрства аховы здароўя, зацверджаная яшчэ ў верасні 2003 года. У адпаведнасці з гэтым дакументам у медыцынскіх установах павінны выкарыстоўвацца растворы толькі прамысловай вытворчасці. Здавалася б, пасля такога «цыркуляра» ў Нясвіжскага завода медыцынскіх прэпаратаў справы павінны былі наладзіцца. Аднак не так усё проста — выконваць пастанову медыцынскія арганізацыі зусім не спяшаюцца. Трэба шукаць выйсце менавіта на дзяржаўным узроўні. Я не кажу, што абавязкова павінны прымяняцца нейкія жорсткія адміністрацыйныя меры, можна знайсці і іншае эфектыўнае рашэнне. Трэба заўсёды мець на ўвазе інтарэсы пацыентаў — вось, напэўна, асноўны момант. У Расіі, напрыклад, у такіх выпадках устаноўлена працэдура ліцэнзавання адпаведнай прадукцыі. У асобных вялікіх клініках падчас вырабу раствораў вытрымліваюцца ўсе неабходныя параметры. Тут няма ніякіх пытанняў і па якасці, і па бяспецы. Магчыма, такі вопыт варты для пераймання?


Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Наталля МАРКАЧЭЎСКАЯ.


Цэх медыцынскіх прэпаратаў.

### «За якасць адказваю!»

Пра якасць прадукцыі варта сказаць асобна. Гэтае пытанне на Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў заўсёды пад самым пільным кантролем. Дырэктарам прадпрыемства зацверджана грунтоўная палітыка ў галіне якасці, дэвіз якой — «Эфектыўнасць, бяспека, канкурэнтаздольнасць». Такое вызначэнне, напэўна, найбольш поўна характарызуе стаўленне да справы. Мэтай палітыкі ў галіне якасці акрэслена павышэнне задаволенасці спажыўцоў праз эфектыўнае функцыянаванне сістэмы кантролю і яе ўдасканальванне, забеспячэнне адпаведнасці якасці прадукцыі патрабаванням спажыўца, забеспячэнне бяспекі прадукцыі для людзей і навакольнага асяроддзя, павышэнне ўзроўню канкурэнтаздольнасці прадукцыі — аснова поспеху РУП «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» і росту дабрабыту ўсіх работнікаў. Асноўнымі задачамі ў галіне якасці пазначаны арыентацыя ўзроўню якасці прадукцыі на ўзровень якасці прадукцыі вядучых прадпрыемстваў шляхам тэхнічнага пераўзбраення, асваення новых працэсаў і тэхналогій, а таксама арыентацыя на рынкавы попыт і канкрэтныя патрабаванні спажыўца падчас асваення новых відаў прадукцыі. Якія ж існуюць шляхі дасягнення пастаўленых важных задач? Перш за ўсё, лічаць на прадпрыемстве, гэта магчыма зрабіць праз усталяванне ўзаемавыгадных і доўгатэрміновых адносінаў з пастаўшчыкамі, асваенне новых відаў прадукцыі на аснове аналізу цяперашніх і будучых патрэб спажыўца. Таксама неабходна праводзіць пастаяннае ўдасканальванне прафесійнага майстэрства работнікаў на аснове бесперапыннага працэсу навучання, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў, арганізоўваць работу па забеспячэнню якасці, якая прадугледжвае рэгламентаваную адказнасць усяго персаналу, ад рабочага да дырэктара, на аснове выкарыстання маральных і матэрыяльных стымулаў да працы. Адна з важных рысаў, якая пазначана ў заводскай палітыцы: кіраўніцтва Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» бярэ на сябе адказнасць за забеспячэнне неабходнымі рэсурсамі для рэалізацыі мэтаў і задач у галіне якасці, эфектыўнае і выніковае выкананне працэсаў, эфектыўнае функцыянаванне сістэмы менеджменту якасці.

— Гэта сапраўды тая сітуацыя, калі кіраўнік можа з упэўненасцю сказаць сваім дзелавым партнёрам, спажыўцам: «За якасць адказваю!» — кажа Сяргей Прасмыцкі. — Захаванне чысціні навакольнага асяроддзя і забеспячэнне якасці — у шэрагу стратэгічных задач. Яскравым доказам таму з'яўляюцца дзве сістэмы міжнароднага менеджменту якасці, якія на прадпрыемстве пацверджаны адпаведнымі сертыфікатамі. Гэта сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням СТБ ISO 9001—2001, якая з'яўляецца гарантыяй таго, што падыход да забеспячэння якасці ажыццяўляецца на пастаяннай і сістэмнай аснове, доказам пастаяннага ўдасканальвання дзейнасці прадпрыемства і імкнення да паляпшэння якасці прадукцыі. Таксама ёсць і экалагічны сертыфікат — сістэма кіравання навакольным асяроддзем адпавядае патрабаванням СТБ ISO 14000—2000, якая гарантуе, што падчас выпуску прадукцыі выконваюцца ўсе ўстаноўленыя патрабаванні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя. Вельмі важны момант як для вытворцаў, так і для жыхароў пасёлка і бліжэйшага райцэнтра. Сёлета плануецца завяршыць работу па стварэнню і сертыфікацыі сістэмы кіравання аховай працы ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ISO 18000. Такім чынам, увесь працэс вытворчасці поўнасцю будзе адпавядаць патрабаванням міжнародных стандартаў. Наступны крок у гэтым накірунку — пераход да міжнародных нормаў і правілаў GMP (Good Manufacturing Practice — належная вытворчая практыка), актыўная работа над гэтым вядзецца ўжо сёння.

### Інвестыцыі ў будучыню

Калі ў пачатку матэрыялу мы ўзгадалі пра буйнейшы інвестыцыйны праект, то мелася на ўвазе грунтоўная рэканструкцыя, якая разгарнулася на Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў. Будоўля, як яе тут называюць, і, напэўна, маюць рацыю — работы сёння ідуць поўным ходам. Удалося пабачыць, як адбываецца абсталяванне так званых «чыстых пакояў» класа «А», «С» (дзе прадукцыя будзе поўнасцю абаронена ад уздзеяння навакольнага асяроддзя). На заводзе рыхтуюцца да адкрыцця новай лініі па вытворчасці інфузійных раствораў па тэхналогіі «Bottlepack». Гэтая тэхналогія ўнікальная — яна не мае аналагаў у Беларусі.

— За адзін тэхналагічны цыкл будуць выдзімацца поліэтыленавыя бутэлькі, у якія адразу разліваюцца растворы і бутэлькі адразу запайваюцца, — тлумачыць начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела РУП «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» Наталля Маркачэўская. — Гэта сусветны вопыт, які знойдзе сваё прымяненне ў нашай дзяржаве. Будзе змантавана самае сучаснае абсталяванне — італьянскай, амерыканскай, польскай і нямецкай вытворчасці. Адказнасць, канешне, вялікая, аднак і цікава працаваць над увасабленнем унікальных тэхналогій.

Новая вытворчасць інфузійных раствораў па BFS-тэхналогіі ўжо, што называецца, «на падыходзе». Адна спецыяльная машына закуплена і хутка прыбудзе. Дарэчы, яе кошт немаленькі — у межах 2 мільёнаў долараў. Агульны ж кошт інвестыцыйнага праекта складае каля 34 мільярдаў рублёў. З іх 22 млрд па лініі ААБ «Беларусбанк» было выдзелена пад гарантыю ўрада, астатняе — уласныя сродкі прадпрыемства.

Зараз ужо заключаны кантракт на пастаўку другой машыны, якую плануюць атрымаць налета — дзесьці ў маі 2008-га. Абсталяванне вельмі складанае — напрыклад, вытворчасць адпаведнай машыны пад канкрэтны заказ займае 12—14 месяцаў. Сыравіну для бутэлек (спецыяльна ачышчаны медыцынскі поліэтылен) плануецца завозіць з-за мяжы. Калі ўстановяць дзве машыны, то гадавая магутнасць лініі складзе 10 мільёнаў упаковак. Новы вытворчы аб'ект будзе пабудаваны і аснашчаны сучасным абсталяваннем у адпаведнасці з патрабаваннямі еўрапейскіх GMP. Калі адбудзецца адпаведная сертыфікацыя, то ў прадпрыемства з'явіцца рэальны шанц гандляваць сваімі прэпаратамі ў краінах ЕС, перш за ўсё — у дзяржавах Прыбалтыкі і ў Польшчы.

— Плануецца, што ўжо сёлета ў верасні будзе атрымана першая прадукцыя па новай тэхналогіі, — адзначае Сяргей Прасмыцкі. — У адпаведнасці са спецыяльнымі нарматывамі яна будзе праходзіць працэдуру рэгістрацыі і сертыфікацыі. Мяркую, што да канца года мы зможам паставіць спажыўцам інфузійныя растворы, якія выпушчаны па BFS-тэхналогіі. Гэта сусветны ўзровень вытворчасці, а сама бутэлька зручная ў выкарыстанні. Дарэчы, ад шкла мы таксама не адмаўляемся — асобныя прэпараты магчыма разліваць толькі ў такую тару. Старыя лініі плануем не закрываць, а рэканструяваць. Тым больш, што на прадпрыемстве ўжо знойдзены дзейсныя шляхі для ўтылізацыі шкляной тары і коркаў да яе. Завод узяў вырашэнне гэтай задачы на сябе, ствараючы для сваіх спажыўцоў самыя спрыяльныя ўмовы для супрацоўніцтва.

На Нясвіжскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў зараз працуюць больш чым паўтысячы чалавек. Як адзначыла Наталля Маркачэўская, на прадпрыемстве распрацавана сістэма навучання персаналу, у тым ліку і па GMP. Тут апраўдана лічаць: кожны работнік павінен разбірацца ў агульнай палітыцы развіцця як уласна прадпрыемства, так і фармацэўтычнай галіны ўвогуле. Толькі ў такім разе магчыма стварыць паўнавартасны калектыў прафесіяналаў, якім пад сілу выкананне любой адказнай задачы. За рабочае месца тут трымаюцца — заробкі на заводзе нядрэнныя. На прадпрыемстве выконваюцца ўсе належныя сацыяльныя гарантыі. Кожны работнік павінен адчуваць, што ўсе яго надзённыя праблемы будуць вырашаны належным чынам. Дырэктар таксама задумваецца і наконт таго, каб падкрэсліць адметнасць знакамітай беларускай Альбы: Сяргей Сяргеевіч марыць адрамантаваць гістарычныя будынкі, якія, на шчасце, тут дагэтуль засталіся, і зрабіць адметныя месцы адпачынку.

**Захар БУРАК, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**


Поліэтыленавыя бутэлькі — гэта сусветны ўзровень.


Апаратчык Аляксандр ГІРКО.


Начальнік хімічнай лабараторыі аналітычнага кантролю АТК Тамара ДАЙЛІД, лабарант хіманалізу Аліна СІРАЖ і хімік Наталля ШЫМКО.


Выконваючая абавязкі начальніка бюро забеспячэння якасці Галіна ДОБЫШ.


Старшы майстар Яўген КІПЕЦЬ.

**РУП «НЯСВІЖСКІ ЗАВОД МЕДЫЦЫНСКІХ ПРЭПАРАТАЎ»**
222603 Мінская вобласць,
Нясвіжскі раён, пас. Альба,
вул. Заводская, 1.
Тэл./факс +375 (1770) 55702
E-mail nzmp@belpak.by
Інтэрнэт-сайт http://nzmp.net